# ФАЛЬКЛОР ЗАГЛЯДВАЕ Ў БУДУЧЫНЮ

**«Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання». Гэта адзіны ў сваім родзе ў краіне інавацыйны праект па падтрымцы, развіццю і прапагандзе традыцыйнай культуры, які штогод ладзяць Міністэрства культуры і ўніверсітэт культуры і мастацтваў.**

Сёлета ў ёй бралі ўдзел 120 даследчыкаў з 9 краін (Беларусь, Балгарыя, Бельгія, Кітай, Літва, Расія, Польшча, Украіна, Францыя). Праграмныя даклады на пленарным пасяджэнні агучылі этнамузыколагі Галіна Кутырова-Чубаля (Польшча) і Наталля Мазурына (Беларусь), арганолаг Ігар Мацiеўскі (Расія), этнахарэолаг Фларыян Карубі (Францыя).

У час канферэнцыі адбыліся тры інтэрактыўныя дзеі для папулярызацыі спадчыны «Фальклор беларускай глыбінкі» з удзелам аўтэнтычнага гурта «Паляшучкі» вёскі Букча з-пад Лельчыц, а таксама музычнай капэлы цымбаліста Івана Валынца, скрыпача Аляксандра Жука і баяніста Уладзіміра Версана з Вілейкі. Зацікавілі майстар-класы ў музеі-скансэне ў вёсцы Азярцо ад Рэгіны Гамзовіч, Аляксея Глушко, Таццяны Пладуновай (Беларусь), Ірыны Паповай (Расія) і Фларыяна Карубі (Францыя). Уразіла насычанай праграмай і вечарына Folk pride з удзелам калектываў Vietakh, Kaukoras, «Ліцьвіны», капэлы смычковай і дударскай музыкі Дзяніса Сухога, Стаса Чавуса і Яўгена Барышнікава, Наталлі Матыліцкай, гуртоў «Талака», «Этнасуполка», «Страла», «Агнявец» і «Раме».

Па меркаванні спецыялістаў, агучаным на круглым стале ў этна-кафэ «Грай», «Аўтэнтычны фальклор-2018» — якасны крок да сістэмнай працы па адраджэнні культурнай памяці. Насуперак адмоўным бакам глабалізацыі традыцыйныя каштоўнасці здольны вярнуць індывідуальнасць і асобе, і народу: у пошуках сучасных агульных перспектыў культуры і мастацтва свету варта памятаць пра іх вытокі ў асобных этнічных традыцыях і перыядычна да іх звяртацца.



*Рэканструкцыя лельчыцкага вяселля студэнтамі курса этнафоназнаўцы Таццяны ПЛАДУНОВАЙ у музеі-скансэне, 28.04.2018, в. Азярцо.*

**Аляксандр МІХНЁНАК**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Минтранс с 21 мая вводит летние ограничения нагрузок на республиканских дорогах